# Нотная грамата

## КАМПАЗІТАР АЛЕГ ЕЛІСЕЕНКАЎ ВЫВОДЗІЦЬ АРТЫСТАЎ У СВЕТ



Уапошнія гады Беларусь спрабуе прарвацца да перамогі на конкурсе "Еўрабачанне". Самае высокае, шостае месца, пакуль займаў дзіма Калдун — выхаванец Елісеенкава! Таму нашу размову з маэстра мы пачалі з высвятлення: у чым сакрэт поспеху?

***— Як вы самі дабіліся прызнання?***

— Я пісаў эстрадную музыку, але спачатку мае песні нідзе не хацелі браць. Усюды гаварылі: нам гэта не падыходзіць. А потым з'явіўся новы праект — конкурс песні ў прыбалтыйскай Юрмале. Удзельнікаў на яго адбіралі ў Маскве. Так атрымалася, што на "Юрмале-88" выступалі два нашы артысты і абодва спявалі песні на маю музыку. Па тэлебачанні ў прайм-тайм, на трансляцыі самага папулярнага фестывалю два разы аб'явілі маё прозвішча! Пасля гэтага мне патэлефанавалі з музычнай рэдакцыі Беларускага радыё: "Алег, мы вас запрашаем да сябе што-небудзь запісаць". "Дык, можа, мне спачатку сыграць?" — спытаў я. "Не, не трэба, прызначайце час, прыязджайце і запісвайце што хочаце!" — такога адказу я не чакаў.

***— Адкуль у вас здольнасць бачыць таленты?***

— Шанцуе, напэўна. Памятаю, як на конкурсе папулярнай музыкі "Зорная ростань" у Лідзе мне паведамілі: да вас гітарыст прыехаў. "Які гітарыст? Гэта ж вакальны конкурс!" — абурыўся я. І вось заходзіць лысы хлопец у кірзавых ботах і ў фуфайцы, садзіцца перада мною. Я яму: "У цябе гітара ёсць?" Ён дастаў шыкоўную гітару, а калі зайграў, я зразумеў: талент! Мы тут жа заснавалі для гэтага хлопца новую намінацыю, сталі ўсяляк яго піярыць, і сёння мне прыемна, што дзідзюЛя заўсёды з удзячнасцю пра гэта ўспамінае.

***— А хто ў свеце вызначае якасць музыкі? Каму гэта дадзена?***

— Людзі, якія разбіраюцца ў музыцы, не абавязкова павінны быць са спецыяльнай адукацыяй. Напрыклад, тэхнічны склад розуму не перашкаджае прасоўванню ў мастацтве. Можа, не ўсе ведаюць, што ў Сярэднія вякі музыка адносілася не да мастацтва, гэта была дакладная навука. У мелодыі ўсё падпарадкоўваецца законам сіметрыі, матэматыкі. Нагадаю, што многія кампазітары са знакамітага рускага кампазітарскага гуртка "Магутная кучка" не з'яўляліся прафесіяналамі. Барадзін, які напісаў оперу "Князь Ігар", быў хімікам, паплечнікам і зяцем Мендзялеева, выдатным навукоўцам, які толькі ў свабодны ад працы час пісаў геніяльную музыку.

***— А што такое наогул геніяльная музыка?***

— Для мяне хітамі заўсёды былі "Багемская рапсодыя" Queen, рок-опера "Ісус Хрыстос — суперзорка". Я стылістычна не ўспрымаў нічога іншага. Але з узростам перастаў насіць "стылістычныя" акуляры і з тых часоў стараюся разумець любую мелодыю. Цяпер у нас на эстрадзе толькі моладзь. Артыстаў сярэдняга і старэйшага пакалення, а таксама музыкі, разлічанай на гэты ўзрост, вельмі мала. А ў 80-я гады было з дакладнасцю

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ



да наадварот — засілле пажылых аўтараў і ўсялякіх народных артыстаў таго жузросту. Я здзіўляюся: дзе ж тая музыка, якую мы слухаем, купляючы заходнія пласцінкі, дзе тая сапраўдная музыка, якую і трэба даваць людзям? Мне было складана зразумець, як можна ў 80-я гады пісаць песні, якія, як я лічыў, былі ў стылістыцы 60-х. А ўсё таму, што мы часам блытаем паняцці "густ" і "якасць". Нашы густавыя прыхільнасці, асабліва ў маладосці, дамінуюць над усім астатнім: тое, што робіцца ў стылі, які нам блізкі, мы лічым якасным, добрым, а тое, што з яго выпадае, — дрэнным. З часам гэтыя "шоры" спадаюць, і тады мы можам распазнаць якасць музыкі.

***— Можа, пра якасць музыкі павінны разважаць не кампазітары, а тыя, хто яе прадае і купляе?***

— Якасць і прадавальнасць не заўсёды ходзяць побач. На жаль, мы ўсведамляем каштоўнасць сваіх хітоў на працягу дзесяцігоддзяў. Калі песня сорак гадоў на слыху — тады прызнаем: та-а-ак, яна класная! Гэта як фары блізкага і далёкага святла. Дык вось, мы свецім толькі фарамі блізкага святла. Маўляў, давайце нам хіт тут і зараз. А трэба разумець, што ёсць песні, якія свецяць далёка, а ёсць тыя, што свецяць блізка. Ёсць песні, якія павінны быць і хітамі-аднадзёнкамі. Без аднадзёнак не будзе сённяшняй эстрады. Зрэшты, вялікаму Сяргею Пракоф'еву было ўвесь час няёмка за вальс з оперы "Вайна і мір". Хоць гэта яго самая, можа быць, хітовая тэма.

***— Што вы думаеце пра "Еўрабачанне"?***

— Прымаць удзел у гэтым праекце таксама важна для краіны, як пасылаць спартсменаў на Алімпіяду і чэмпіянаты свету. Гэта дае жыхарам Еўропы магчымасць даведацца пра тое, што ёсць такая краіна Беларусь.

***— А выйграць у конкурсе як? У вас ёсць рэцэпт?***

— Тут трэба ўспомніць прымаўку "што рускаму добра, то немцу смерць". Я толькі б яе перафразаваў — "што для нашага нацыянальнага конкурсу песні добра, то для "Еўрабачання" — пройгрыш". Любы патэнцыяльны шлягер, які ідзе на "ура" ў аўдыторыі Беларусі, асуджаны на правал у Еўропе. Так што аптымальнай для "Еўрабачання" варта лічыць песню, якую наша публіка прыме халаднавата. І наогул: не трэба пераацэньваць значэнне "Еўрабачання". Гэта добра "ўпакаваны" конкурс, а па якасных адносінах гэта той жа беларускі конкурс "Зорная ростань". Калі я глядзеў трансляцыі з Осла, то мне падавалася, што некаторыя выканаўцы не прайшлі б у фінал "Зорнай ростані" проста па сваім выканальніцкім узроўні.

***— Што вы можаце прапанаваць маладому таленту, які возьмецца з вашай дапамогай рухацца на вялікую сцэну?***

— Да мяне прыходзяць і пытаюць: "А колькі каштуе ваша песня?" Я заўсёды прапаноўваю сесці і папрацаваць разам. Можа, я пачую ваш голас і буду вымушаны яшчэ заплаціць, мець задавальненне працаваць з такім геніем, як вы. Хацелася б знайсці артыста, якога б не толькі прыходзілася цягнуць, але які быў бы сам маторчыкам — тады ехалі б разам з падвоенай хуткасцю. І тады б атрымліваліся прарывы.

Віктар **Корбут**

## ДАСЬЕ

**■ Алег Елісеенкаў вырас у беларускім горадзе Маладзечна. Бацька быў адным з заснавальнікаў мясцовага музычнага вучылішча. Елісеенкаў у 1982 годзе скончыў Белдзяржкансерваторыю, дзе вучыўся ў кампазітара Дзмітрыя Смольскага. З 1986 па 1987 год сам выкладаў на кафедры эстрады Мінскага інстытута культуры.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ